ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 83 (1352) | СУБОТА, 11-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!
19-га красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары
— АДБУДЗЕЦЦА —
УСЕБЕЛАРУСКІ АГУЛЬНЫ РАДЫЁ-СХОД
комсамольцаў і чытачоў „Чырвонкі", прысьвечаны 10-гадоваму юбілею старэйшай комсамольскай газэты—„Чырвонай Зьмены".
У сходзе ўдзельнічаюць; Менск, Віцебск, Гомель, Ворша. Слуцак, Дрыса, завод „Кастрычнік" (Сьвіслач).
Пасьля сходу—концэрт.
Настрайвайце на радыё-хвалю 700 мэтраў

Мозг, машыны і рукі—на поўны ход

Змагацца за 45, 518 і 1040!

Тысячамі ўдарнікаў, узброеных тэхнічнымі ведамі, сустрэць другую гадавіну соцспаборніцтва

ГОДЫ БАЛЬШАВІЦКАГА НАСТУПУ

Праз дзьве дэкады рабочая кляса Савецкага Саюзу адзначае другую гадавіну соцыялістычнага спаборніцтва. Сьвяткаваньня другой гадавіны саўпадзе з правядзеньнем вялікага сьвята сусьветнага пролетарыяту—з днём Першага Мая.

За мінулыя два гады, пры разгорнутым соцыялістычным наступленьні, рабочая кляса пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі дабілася вялікіх посьпехаў.

За гэты час вырасьлі новыя гіганты соцыялістычнай індустрыі, краіна ўступіла ў апошні этап нэпу і прыступіла к завяршэньню пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Сьвяткаваньне другой гадавіны соцспаборніцтва адбываецца ў час выкананьня гіганцкіх плянаў 3-га году пяцігодкі. 3-ці год, гэта год нябачаных тэмпаў, гэта—45 проц. падвяцьця прамысловасьці, гэта—518 новых фабрык і заводаў, гэта—1040 новых МТС!

Апошняя адозва тульскіх рабочых, прысьвечаная другой гадавіне соцспаборніцтва, сустрэла шырокі водгук у гушчах працоўных мас.

У адказ тульцам зьяўляюцца новыя ўдарныя брыгады імя 518 і 1040, расьце масавая хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Ленінскі комсамол і рабочая моладзь, у адказ на заклік тульцаў, рыхтуе і выходзіць са сваім комсамольскім адказам.

У адказ тульцам, комсамольцы менскай абутковай фабрыкі абвясьцілі вайну браку і паход за лепшую якасьць продукцыі, комсамольцы менскага дрэваапрацоўчага заводу абавязаліся ліквідаваць прарыў першага кварталу і забясьпечыць выкананьне плянаў 3-га году пяцігодкі.

Яны стварылі новыя ўдарныя брыгады, абвясьцілі паход за тэхніку і якасьць, за рацыяналізацыю і вынаходства.

Другая гадавіна соцыялістычнага спаборніцтва і сьвяткаваньне Першага Мая будзе адзначана поўнай ліквідацыяй прарываў першага кварталу і перавыкананьнем плянаў другога кварталу.

Другую гадавіну соцспаборніцтва неабходна сустрэць новымі тысячамі ўдарнікаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, новымі вытворча-бытавымі комунамі, ударнымі агрэгатамі, цэхамі і прадпрыемствамі.

Неабходна правесьці праверку ступені аўладаньня тэхнікай, наколькі скарыстоўваю ца ўсе нашы машыны, сыравіна і кадры.

Соцспаборніцтва—магутная зброя пераможнага пролетарыяту-павінна быць узьнята на вышэйшую ступень.

„Справа гонару, мужнасьці і славы"—45 проц., 518 і 1040 павінны стаць сьцягам да далейшай барацьбы і перамог на фронце пасьпяховага завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі Савецкага Саюзу.

Давялі прамфінплян да варштата

За апошні месяц першага кварталу Віцебская шчацінная фабрыка ліквідавала свой прарыў.

Фабрыка дабілася вялікіх дасягненьняў у выкананьні прамфінпляну. Калі студзень даў 89 проц., а люты 88 проц. выкананьня, дык сакавік месяц даў 108,47 проц. у кантоўным выразе, а валавое выпрацоўкі ў натуральным выразе—106,6 проц.

Сабекошт зьніжаны на 1,8 проц. вытворчасьць працы у натуральным выразе дала 118,5 проц., а ў цэнасным—120,9 проц.

Рабочыя ўзялі на буксір бухгальтэрыю з тым, каб яна канчаткова давяла прамфінплян да варштату.

Так рабочыя фабрыкі, пры шырока разгорнутым соцспаборніцтве, здолелі дабіцца вялікіх посьпехаў.

Д. Славуцкі



Вытворчая комуна моладзі лакіровачнага цэху заводу „ДА" (Менск) якая падае ўзоры лепшай працы.

Зьлева направа: т. т. Аронава, Кантаровіч, Бацьвінік, Зайцава і Бацьвінік Р.

Штурмуем прарывы

Завод „ДА" (Менск) скончыў першы квартал з прарывам: прамфінплян выкананы толькі на 99,75 проц. Па цэхох, як зборачны,—прамфінплян выкананы толькі на 89,67 проц.

Комсамольская організацыя абвясьціла двухтыднёвік штурму прарываў у другім месяцы першага кварталу. Зборачны цэх склаў дзьве ўдарныя комсамольскія брыгады і тры вытворчыя комуны, якія з посьпехам перавыконваюць свой прамфінплян. Не пасьпеўшыя выканаць свой плян за 7-м працоўных гадзін, застаюцца звыштэрмінова і выконваюць.

Мэханічны цэх склаў комсамольскую ўдарную зьмену імя „КІМу". Для ліквідацыі прарываў у падсобным кляільным цэху комсамольская організацыя склала скразную брыгаду і прарыў быў у значнай меры ліквідаваны

У адказ на адозву тульскіх рабочых, комсамольская організацыя заводу, сумесна з беспартыйнай моладдзю, абавязалася выканаць наступнае:

1. Выканаць і перавыканаць прамфінпляны падсобных цэхаў з тым, каб закончыць другі квартал з перавышкай.

2. Дабіцца да 1-га маю 100 пр. ахопу соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам і організацыі новых чатырох вытворчых комун у мэханічным цэху, вытворчых комун у зборачным цэху, па адной комуне ў сьлясарным і лесапільным цэхах.

3. Наладзіць тэхнічную вучобу, змагаючыся за 100 проц. ахоп рабочае моладзі тэхнічнымі гурткамі. За другі квартал дабіцца рэалізацыі ўсіх рацыяналізатарскіх прапаноў.

4. Поўнасьцю ліквідаваць брак, прагулы і простоі сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

5. Да другой гадавіны соцспаборніцтва і першага мая ўцягнуць усю беспартыйную моладзь у рады ленінскага комсамолу.

Палепшыць культмасавую працу

Дрэваапрацоўчы цэх Бабруйскага комбінату сыстэматычна не выконвае прамфінплян. За апошні час цэх пераключыўся на чарапашыя тэмпы. Вялікая колькасьць браку, безгаспадарчасьць, простоі, дрэнная культмасавая праца, слаба разгорнутае соцспаборніцтва зрываюць выкананьне пляну.

Неабходна прыняць тэрміновыя захады палепшыць работу цэху з тым, каб да гадавіны соцспаборніцтва цалкам выканаць прамфінплян.

М. Габрынец.

ВАРШАЎСКАЯ АНТЫСАВЕЦКАЯ ІНСЦЭНІРОЎКА—ПАЧАЛАСЯ

ВАРШАВА, 9.—Пасьля чыткі абвінавальнага акту, суд заслухаў заяву Палянскага, які не гледзячы на неаднакротныя напамінкі старшыні працягвае неўзаметку чытаць свае паказаньні на пісаными, апраўдваючыся „слабой памяцьцю".

Падсудны прызнае, што ён зьмясьціў у дымаходнай трубе савецкага пасольства адзкую машыну, Але ўсё гэта было зроблена, быццам-бы, ня з мэтай ўзрыву пасольства, а ў выглядзе „дэмонстрацыі" супроць савецкай ўлады каб давесьці неабходнасьць барацьбы з бальшавізмам. Ён, Палянскі „хрысьціянін і не жадае рабіць дрэннага". „Чалавек зьяўляецца зброяй госпадага",—разважаў Палянскі, па яго словах, на даху савецкага паўпрэдства і рашыўшыся давесьці „моральную перавагу хрысьціянства над бальшавізмам", перарэзаў быццам-бы у некалькі мясцох электрычныя правады для таго, каб ні ў якім выпадку не адбыўся выбух. Па словах Палянскага ён прыняў ўсе меры для таго, каб давесьці бальшавіком, што ён мог-бы ўзарваць пасольства, „але не хацеў гэтага зрабіць". Таму Палянскі зрабіў, нібыта такую праводку, што яна магла быць адразу выкрыта і зьнішчана і сапсаваў электрычны контакт, які злучаў адзкую машыну з электрычнай праводкай, сконструяваў, нібыта такі ўдарнік у бомбе, каб не маглі атрымацца іскры. сабраў нібыта знарок няправільна мэханізм гадзіньніка і напоўніў знарад такой выбуховай матэрыяй якая ня магла разарваць нават яго абалонку.

З далейшых паказаньняў аказваецца аднак, што Палянскі зрабіў так ня стольні з хрысьціянскіх пабуджэньняў, скольні з-за таго, што імкнуўся загадзя падрыхтаваць „довады", якія зьмякчылі-б яго віну, бо ён „адчуваў" што яму прыдзецца адказваць перад судом. Ужо пры першых пытаньнях прокурора і членаў суда Палянскі безнадзейна блытаецца; Палянскі ня можа растлумачыць, як ён бяз ніякай дапамогі арудаваў на даху, прымацоўваў электрычныя правады, ус анаўлі аў адзкую машыну. Да рэчы, прокурор па гэтаму пытаньню не націскае на падсуднага. Допыт аб існаваньні супольнай організацыі, пасылаўшай Палянскага на гэтую справу, пакуль ня цікавіць прокурора.

Пасьля ўнага правалу спроб Палянскага выкруціцца пры расьледваньні фактычнага боку справы, Палянскі таксама няўдала імкнецца адыгрався на політычным. Ён расказвае, што ў СССР яго чакала „бліскучая кар'ера", але гэтай кар'еры перашкодзіла, зноў да рэчы, яго „хрысталюбства": ён не хацеў, бачыце есьці савецкі хлеб, не хацеў прыняць на сябе за гэта цяжкі крыж. Палянскі расказвае вялічэзны артыкул аб тым, быццам савецкая ўлада шукала яго, абвінавачваючы яго ў „організацыі замаху ў маскоўскім Крэмлі" у 1924 годзе. Прычым за яго спайманьне, нібыта, была назначана ўзнагарода ў 10 тыс. руб.

Палянскі імкнецца затым перайсьці да больш агульных політычных пытаньняў. „Самым вялікім няшчасьцем для ўсякай дзяржавы зьяўляецца,—гаворыць ён, цярпець у сваім організьме савецкае прадстаўніцтва". Асканаліўшыся на політычным экзамене і спайманы на сьвежым учынку ў тым, што ў расьсьледваньні фактычнага боку справы ён хлусіў, Палянскі праяўляе выключную нядбайнасьць у часе допыту сьведкаў.

Першым дапытваецца камісар політычнай паліцыі Галчынскі, потым дворнік суседняга з паўпрэдствам дому Качынскі, поліцэйскія Андруховіч, Скрынкоўскі, Сахачынскі, піротэхнік Махай.

Асноўныя моманты допыту сьведкаў заключаюцца ў высьненьні раду тэхнічных пытаньняў, якія былі зьвязаны з пабудовай адзкай машыны, гадзіньнікавага мэханізму і электрычнага праваду. Ад гэтых паказаньняў большасьці сьведкаў разьбіваюцца сьцьверджаньні Палянскага аб яго „хрысьціянскім ашуканстве" і спробы зьвесьці замах у „нявінную дэмонстрацыю" супроць бальшавікоў. „Усе сьведкі аднагалосна сьцьверджаюць, што провад нідзе перарэзан ня быў.

* * *

ВАРШАВА, 9. Сёньня, а 10 гадзіне раніцы, у варшаўскім акруговым судзе пачалася слуханьнем справа Яна Палянскага па абвінавачваньню яго ў організацыі замаху на савецкае прадстаўніцтва ў Варшаве. Заля суда ітком набіта. У залі знаходзіцца саветнік, першы сэкратар і атташэ ярубу паўпрэдства СССР у Варшаве. На суд выклікана 35 сьведак.

Роўна а 10-ай гадзіне ўводзяць падсуднага Палянскага. Гэта моцна складзены мужчына, сярэдняга росту, год 40 з характэрным агідным тварам крымінальнага злачынцы. Уражаньне агіды ад зьнешнасьці Палянскага падкрэсьлівае сёньня увесь вячэрні друк. Ужо з першых слоў, выказаных Палянскім на судзе, відна і політычная лінія яго самаабароны. Палянскі ня ўпускае ніводнага выпадку, каб не падкрэсьліць лішні раз сваю хрысьціянскую пакорнасьць і дабрачыннасьць.

Перад чыткай абвінавальнага акту абарона, прадстаўленая двума адвакатамі, робіць спробу сарваць процэс. Абаронца Астроўскі патрабуе спыніць процэс па формальных прычынах і „анулюваць наогул процэс па сутнасьці". Адвакат заяўляе, што польскі суд ня мае права разглядаць гэтую справу, бо выдача югаслаўскім судом Палянскага польскім судовым уладам адбылася незаконна, па-першае, таму, што югаслаўскі суд быў уведзен у зблытаньне польскімі ўладамі, якія заяўлялі, што Палянскі зьяўляецца польскім грамадзянінам, у той час, як Палянскі такім не зьяўляецца, ды яшчэ і таму, што суд у Любляне (Югаславія) няправільна расцаніў акт Палянскага, як крымінальнае злачынства, у той час, як яно зьяўляецца бязумоўна політычным.

Суд адхіліў патрабаваньне абароны і пастанавіў працягваць судовае сьледства, якое началося чыткай абвінавальнага акту.

Агляд-праверка Менску па рост

РАСТУЦЬ „НАОГУЛ“

На ф-цы „Кастрычнік“ 300 ударнікаў па-за комсамолам, на Менбудзе толькі 30 проц. рабочай моладзі у КСМ

Іх чакае КСМ

9-ы зьезд комсамолу па справаздачы ЦК аб росьце запісаў: „констатуючы правільнасьць лініі ЦК у пытаньні росту зьезд, аднак, прызнае недастатковы ахоп саюзам рабочае моладзі“.

Зьезд паставіў перад комсамолам неадкладную і баявую задачу: „ператварыць УсеЛКСМ у шматмільённую арганізацыю ў бліжэйшы час“.

Прашло больш трох месяцаў з таго часу, як прынята гэта важнейшая постанова. Аднак, прыходзіцца констатаваць, што самацёк і кампанейшчына ў росьце ў радзе месц ня зьнішчаны. Аб гэтым гавораць матар'ялы агляду—праверкі колектываў і ячэек Менскай комсамольскай організацыі, якія сёньня намі друкуюцца.

300 ударнікаў па-за комсамолам

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Кастрычнік“ на 1931 год налічвае 328 комсамольцаў, у 1930 іх было 282.

Рост за 4 месяцы—46 чал.

46 у комсамоле, а 300 па-за шэрагамі КСМ, прычым гэтыя 300 амаль што ўсе зьяўляюцца ўдарнікамі. Гэтая лічба—46 зьяўляецца паказчыкам самацёку, бяссыстэмнасьці ў рабоце комсамольскіх ячэек і колектыву „Кастрычніка“ у галіне выкананьня рашэньняў зьездаў аб 100 проц. ахопе рабочай моладзі комсамолам.

Комсамольскі агрэгат налічвае каля 300 маладых рабочых і работніц, з іх комсамольцаў толькі каля 120-130 чалавек.

Ці вядзецца работа на ўцягненьню моладзі ў КСМ? Нельга сказаць, што зусім ніякай работы не праводзіцца. Але яна не сыстэматычная, прыстасоўваецца звычайна да якой-небудзь кампаніі.

Вось прыклад: рыхтавалася комсамолія „Кастрычніка“ да 10-годзьдзя існаваньня партколектыву. Хлопцы заварушыліся наконт росту.

Даручалі кожнаму комсамольцу весьці работу са сваім суседам па варштату, не-комсамольцам, каб уцягнуць яго ў КСМ. Праводзіліся ў вучастковых брыгадах гутаркі з беспартыйнай моладзьдзю.

Добрыя вынікі дала гэтая работа. За кароткі тэрмін колектыў вырас на 24 чал. Але прайшоў юбілей, работа сьціхла.

Прыйдзе яшчэ якая-небудзь кампанія, мабыць зноў заварушацца хлопцы наконт росту.

Штодзённай работы няма. Групоргі толькі скардзяцца, што хлопцы ня ідуць у комсамол. Але аб тым, як яны (групоргі) уцягваюць гэтых хлапцоў у комсамольскую і грамадзкую работу, як прыцягваюць іх на сходы ячэек, ці даведзены да ведама кожнага маладога рабочага рашэньні 9-га і 10-га зьездаў комсамолу, як гэтая моладзь уцягваецца ў падрыхтоўчую работу да пращелігбою,—аб гэтым групоргі маўчаць. Станоўчага адказу яны даць ня змогуць.

С.

„РОСТАМ МЫ НЕ ЗАЙМАЛІСЯ“

„А сказаць па праўдзе, дык я і сам ня ведаю колькі комсамольцаў і рабочай моладзі ў нашым колектыве“,—так адказаў сэкратар комсамольскага колектыву Менбуду тав Гурэвіч на запытаньне нашай брыгады.

Колектыў яднае тры ячэйкі: пры пабудове політэхнікуму і клінгарадка, пры базе і пры самым групкоме Менбуду.

Пры абсьледваньні ячэйкі на базе брыгада не дастала дакладных вестак ня толькі аб колькасьці рабочай моладзі, але і аб колькасьці комсамольцаў. Адзін член бюро кажа: „у ячэйцы каля 35 чалавек“, другі кажа—„каля 30-ці“, так і не дабіліся дакладнасьці.

На базе шмат рабочай моладзі, якая можа быць у комсамоле. Што-ж рабіла ячэйка, каб уцягнуць яе ў комсамол?—„Мы гэтым пытаньнем не займаліся“—кажа сэкратар колектыву, які адначасова зьяўляецца і сэкратаром цэхавай ячэйкі.

Ячэйка абслугоўвае 40 чалавек будвучнаў, больш-менш організаваную масу, але сярод іх толькі 11 комсамольцаў.

Былы склад бюро ячэйкі на чале з сэкратаром т. Кантарам пытаньнем росту ніколі не займаліся. І вось, ад часу комсамольскіх зьездаў, ніводзін малады рабочы ня прыняты ў комсамол. А магчымасьці для росту ёсьць. У адным толькі Будвучы ёсьць каля 30 чалавек, якія могуць і павінны быць у комсамоле. Аб гэтым з усёй яскравасьцю кажа праведзены лятучы мітынг па пытаньню „чырвоназьменаўскага набору“, які даў 4 маладых рабочых у комсамол.

Брыгада „ЧЗ“ Каплан, Рашын, Фрыд і Львовіч.

ЗАМЕСТ РОСТУ—АДСЕЎ

Рост комсамольскай організацыі ў Лёзьненскім раёне надзвычайна ганебны. За апошні месяц—паўтара комсамольская організацыя вырасла на 20-30 чалавек, выключылі з радоў комсамолу ня менш 10 чалавек.

У паасобных комсамольскіх ячэйках (колгасы „Віцебскі Пролетары“ 10-ы Кастрычнік“ і інш.)—выключэньне перавышае рост.

Цэлы рад ячэек („Бальшавік“, „Чырвоны Сьвет“ „Сітно“, „Чырвоны Араты“) за апошнія два месяцы ня вырасьлі ні на аднага чалавека.

А чым ўсё гэта тлумачыцца?. Тым што комсамольскія ячэйкі зусім закінулі працу з батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзьдзю. Не прыцягваюць моладзь да канкрэтнай працы у комсамольскіх ячэйках.

А трэба сказаць, што комсамольская організацыя Лёзьненшчыны мела некаторыя посьпехі ў галіне росту у пэрыод прадзьездаўскай работы.

Наогул трэба адзначыць, што некаторыя комсамольскія ячэйкі Лёзьненскага раёну зусім дрэнна працуюць. Комсамольскія ячэйкі колгасаў „Новы Усход“ Новы Шлях“ в. Сутокі—існавалі толькі на паперы. Комсамольцы ячэйкі колгасу „10-ы Кастрычнік“ не наведваюць лікпункту і сходаў ячэйкі.

З такімі фактамі можна сустрэцца і ў ячэйках „Бальшавік“, „Сітно“ і інш.

Кароль.

У барацьбе за шматмільённы комсамол

Пераход ад груп садзейнічаньня партыі да комсамольскіх ячэек, на аснове перабудовы ўсёй комсамольскай работы на службу баявой і політычнай падрыхтоўцы, глыбокая адданасьць генеральнай лініі партыі і актыўная барацьба за яе выкананьне значна павысілі ролю комсамолу, як актыўнага і непасрэднага дапаможніка партыі.

Гэта характарызуецца наступнымі паказчыкамі: калі за ўвесь 1930 г комсамольскімі організацыямі Н-скай Самарскай ударнай каўдывізіі было прынята у комсамол 843 чалавекі, дык толькі за 2 з паловай месяцы (студзень-люты-палова сакавіка) у комсамол прынята 581 чалавек, з пададзеных 702 заяў аб уступленьні. Павялічыліся тэмпы росту амаль у 4 разы.

Комсамольскія організацыі дывізіі тым, хто ішоў у комсамол, прад'яўлялі асноўныя патрабаваньні: праводзіць на практыцы ў жыцьцё генеральную лінію партыі, як найлепей выконваць кантрольныя лічбы баявой падрыхтоўкі, актыўна ўдзельнічаць у соцспаборніцтве і ўдарніцтве.

Лепшыя ударнікі баявой падрыхтоўкі, рабочыя, батракі, перадавыя колгасьнікі, перадаваліся комсамольскімі організацыямі ў партыю. З 615 чалавек, якія былі прыняты ў партыю, комсамольцаў—377 ч.

Аднак, побач з гэтымі дадатнымі бакамі у галіне росту, трэба падкрэсьліць і недахопы. Асноўнае ў тым, што комсамольскія організацыі ня здолелі яшчэ поўнасьцю ахапіць сваім уплывам усю рабоча-батрацкую частку чырвонаармейцаў.

Баявая задача—значна ўзмацніць сваю работу.

Шыфрын і Дубрынін

ДАЛАКОПЫ РОСТУ

Выкананьне рашэньняў 9-га зьезду аб „ператварэньні УсеЛКСМ у шматмільённую організацыю ў бліжэйшы час“ зьяўляецца адной з чарговых задач комсамолу, якая патрабуе рашуча, па-бальшавіцку паскорыць выкананьне лёзунгу: „100 проц. рабочай моладзі ў КСМ“.

Але да практычнага выкананьня гэтай задачы некаторыя ячэйкі, колектывы, а таксама і камітэты адносяцца опортуністычна.

Перад намі пара лістоў маладога рабочага Ф. Е. і некаторых беднякоў-колгасьнікаў.

Паслухаем першага:

„У 1928 годзе я падаў заяву ў комсамол. Тады я працаваў на зав. „Зорка“, Агульным сходам колектыву я быў прыняты. Мяне лічылі комсамольцам, я хадзіў на зачыненыя сходы ячэйкі, выконваў нагрузкі і г. д.“

Але здарылася так.

„У 1929 годзе абралі мяне для пасылкі на раённыя піонэр-курсы. Я паехаў, але там я даведаўся, што я не комсамолец, што мае анкеты РК не атрымаў. Такім чынам, прабыўшы каля году ў комсамоле, з-за галавацяпства я апынуўся па-за яго радамі.

Я паехаў зноў на завод і пачаў нанава „уступаць у комсамол“. Праз некаторы час я перайшоў на працу у коопэрацыю, куды мяне вылучыў завод.

У прыёме мне адмовілі толькі таму, што я стаў „служачым“.

Паслухаем другі ліст:

„12-га лютага 1930 году мы, вучні старадароскай ШКМ, у колькасьці 4 асоб падалі заяву ў Старадароскую ячэйку аб прыёме у комсамол. Па соцыяльнаму становішчу зьяўляемся колгасьнікамі-беднякамі.

Доўга цягнулі з прыёмам. Але, нарэшце, у канцы сакавіка бюро ячэйкі прыняло нас у комсамол. Прыём павінен быў зацьвердзіць агульны сход.

„Калі пачалі зацьвярджаць на сходзе нашы кандыдатуры, аказалася, што тэхсэкратар згубіў нашы анкеты. Справу адкажылі, запрапанаваўшы ў другі раз падаць заявы“. Гэтым канчаецца ліст групы колгасьнікаў-беднякоў.

Але мы ня можам абыйсьці моўчкі той злачыннай валакіты і „канцылярскага футболу“, які сустракаецца ў прыёме маладога рабочага, маладога колгасьніка бедняка ў комсамол.

Мы патрабуем, каб Петрыкаўскі і Старадароскі РК ЛКСМБ тэрмінова расьсьледвалі гэтыя злачынныя факты валакіты і прыцягнулі вінаватых да суровай адказнасьці.

Х.

НАЗЫВАЕЦЦА—„ВЫРАСЬЛІ“

Комсамольскі колектыў Менскага Архітэктурна-дарожнага тэхнікуму мае ў сваім складзе 270 чалавек.

За апошні навучальны год колектыў вырас на 33 чалавекі, прычым ячэйка архітэктурнага аддзяленьня вырасла на 32 чалавекі, а ячэйка дарожнага аддзяленьня толькі НА АДНАГО.

Такі ганебны рост ячэйкі дарожнага тэхнікуму тлумачыцца тым, што бюро гэтай ячэйкі ніякай працы не праводзіла сярод беспартыйнай рабочай і батрацка-бядняцкай колгаснай моладзі для ўцягваньня яе ў комсамол.“

У сэкратара і політ-прасьветпрацаўніка ячэйкі ёсьць шкодная думка, „што нам няма як расьці: усё гэта—інтэлігенцыя“. (?!) А ў гэтым годзе залічана на 1-шы курс каля 70 проц. рабочых і іх дзяцей, рэшта—бядняцка-колгасная моладзь.

Брыгадзір „ЧЗ“ С.

Масавы прыём у комсамол

КУЗЬНІ САЮЗНЫХ КАДРАЎ—ЛЕПШЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ

(З ліста ЦК ЛКСМБ усім ГК, і РК ЛКСМБ)

Задачы замацаваньня і далейшае паглыбленьне павароту комсамолу тварам да гаспадарчага будаўніцтва, мобілізацыя шырокіх мас комсамольцаў і ўсёй працоўнай моладзі на выкананьне 5-ці годкі 4 ў гады, на выкананьне задач 3-га, рашаючага, ператварэньне комсамолу ў шматмільённую організацыю прад'яўляюць вялікія запатрабаваньні да нашага комсамольскага кіраўніцтва, патрабуюць больш дыфэрэнцыйнага кіраўніцтва і надвышэньня тэорэтычнага ўзроўню актыву.

Рашэньне Сэкратарыяту аб павялічаньні колькаснага і якаснага складу курсаў комсамольскага актыву ўскладае вялікія задачы на раённыя і гарадзкія камітэты комсамолу. Комплектаваньне цэнтральных курсаў комсамольскага актыву, якое зараз пачалося, павінна знайсьці сваё адпаведнае месца ў рабоце камітэтаў і ячэек комсамолу.

Патрэбны ня голае разьмеркаваньне дадзенай ЦК разьвёрсткі, а растлумачальная работа сярод шырокіх мас комсамольцаў аб значэньні курсаў. Згодна пастановы Сакратарыяту ЦК, на курсы прыймаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б комсамольцы. Курсы павінны быць поўнасьцю ўкомплектаваны да 15-га мая.

Вось чаму неабходна зараз-жа, па атрыманьні правіл прыёму і інш. матар'ялаў, разгарнуць шырокую работу па комплектаваньню.

Разьвёрстка месц па пасылцы на курсы комсамольскага актыву:

Асіпавіцкі—2 Азарыцкі—2, Асьвея—1, Бабруйск—6, Багушэўск—1, Боркавічы—1, Барысаў—6, Бешанковічы—1, Бягомля—2, Брагіна—2, Буда-Кашал.—2, Быхаў—2, Бялынічы—1, Бярэзіна—2, Ветка—2, Ветрына—2, Віцебск—гор.—12, Вула—1, Вушачы—1, Высачаны—1, Гарадок—2, Глуск—1, Гомель—гор.—13, Горкі—4, Грэск—1, Дрыбін—2, Дрыса—2, Дуброўна—2, Жлобін—4, Журавічы—1, Жытковічы—1, Заслаўль—2, Камарына—1, Капаткевічы—1, Капыль—1, Карміны—1, Касьцюковічы—2, Каралін—2, Клімавічы—2, Клічаў—1, Койданава—2, Копысь—2 Коханава—2, Крычаў—1, Круглае—2, Краснапольле—1, Лагойск—2, Лёвна—1, Лельчыцы—1, Лепель—2, Лоеў—1, Любань—2, Лады—1, Магілеў-гор.—7, Мазыр—7, Мяжа—1, Мсьціслаўль—2, Нароўля—1, Парычы—2, Петрыкаў—4, Плешчавіцы—2, Полацак—7, Прапойск—1, Пухавічы—2, Рагачэў—4, Расна—1, Прасоны—2, Рэчыца—4, Сенна—1, Сіроцін—2, Слуцак—4, Смалявічы—2, Старыя-Дарогі—1, Старобін—2, Сураж—2, Сьвіслач—1, Сьмілавічы—2, Талочын—2, Тураў—1, Уваравічы—1, Узда—2, Менск—15, Хойнікі—4, Хоцімск—2, Халопенічы—1, Цэрахоўка—1, Чавусы—1, Чарэя—2, Чэчэвічы—1, Чачэрск—2, Чашнікі—1, Чэрвень—2, Чэрыкаў—2, Чырвоная-Слабада—1, Шклоў—3, Юравічы—1, Ворша—9.

Правяраем гатоўнасьць да сяўбы

ТАК ПРАЦАВАЦЬ НЕЛЬГА!

БССР па кантрактацыі на апошнім месцы

Да 15 красавіка скончыць 100 проц. кантрактацыю яравых і пераход на зьдзельшчыну колгасаў.

Гураганным агнём ударыць па кулаку і яго агентах правых і „левых" опортуністых, якія зрываюць пасьпяховую падрыхтоўку да сяўбы

УЗЯЦЬ БАЛЬШАВІЦКУЮ ХУТКАСЬЦЬ

Паводле дырэктыў партыі кантрактацыя яравых пасеваў павінна быць скончана да выхаду ў поле.

Як-жа ідзе кантрактацыя яравых па БССР?

На 1-е красавіка рэспубліканскі плян кантрактацыі яравых пасеваў выканан ўсяго толькі на 19,8 проц., а калі ўзяць выкананьне пляну кантрактацыі пасобных вядучых культур, якімі ва ўмовах БССР зьяўляецца лён і канопля, плян выканан толькі на 16,3 проц.

У чым корань прычыны нездавальняючага стану кантрактацыі яравых пасеваў і асабліва лёну і канопель?

Па-першае—адсутнасьць масавай працы. Яшчэ да гэтага часу не даведзены да ведама шырокіх колаў колгасьнікаў і працоўных сялянскіх гаспадарак тыя матэр'яльныя рэсурсы і ільготы, што дае дзяржава па кантрактацыі і ўздыме ільнаводнай гаспадаркі.

Па-другое—бязьдзейнасьць і опортуністычнае дабрадушша колгасна-коопэрацыйнай організацыі і ільнаводсаюзаў, на я іх ўскладзена непасрэднае правядзеньне ўсёй опэрацыйнай працы па кантрактацыі.

Нарэшце, недапушчальная бязьдзейнасьць раду камсамольскіх організацый, якія ня ўключыліся па-баявому на правядзеньне кантрактацыі.

Набліжаецца дні выходу на сяўбу. Трэба зараз-жа і як мага хутчэй скончыць працу на 100 проц. кантрактацыі яравога пасеву.

Што для этага трэба зараз зрабіць?

Разгарнуць шырокую масавую працу ў колгасах і вёсках, давесьці да колгасаў і гаспадарак плян кантрактацыі яравых пасеваў і прапрацаваць з імі адозву ЦК і СНК.

Даць цьвёрдае заданьне кулацкім гаспадаркам для пасеву яравых.

Устанавіць кантроль над працай колгасна-коопэрацыйнай сыстэмы органамі Наркамснабу і Наркамзему, дапамагчы ім перабудаваць працу сапраўды на опэрацыйныя рэйкі.

Рашуча змагацца з кулацкай агітацыяй супроць кантрактацыі і права-опортуністычнай практыкай паасобных мясцовых організацый.

Барацьба за кантрактацыю ёсьць барацьба за суцэльную колектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы—гэта авінна ўразумець кожная комсамольская ячэйка і комсамолец і ўзяцца па-ўдарнаму, па-бальшавіцку за выкананьне пляну кантрактацыі.

Жыткавіцкі, Церахоўскі, Капаткевіцкі, Сураскі, Сьмілавіцкі, Дубровенскі і Халопеніцкі раёны зрываюць кантрактацыю яравых

Стан выкананьня кантрактацыі яравых прымушае біць трывогу. Рэспубліканскі плян кантрактацыі збожжавых культур выканан толькі на 19,3 проц. ільнавалакна—на 23,2 проц. (з якіх у колгасах 42 проц.), пянькі—на 27 проц., бульбы —12,8 проц, тады як урадам быў вызначан тэрмін скончыць кантрактацыю да першага красавіка:

У чым прычына нездавальняючага ходу кантрактацыі? Галоўная прычына—гэта бязьдзейнасьць цэлага раду раённых організацый, опортуністычны самацёк і недаацэнка палітычнай важнасьці гэтай найважнейшай кампаніі.

Весь яны—зрыўшчыкі пляна ў кантрактацыі.

Барысаўскі, Прапойскі, Лупалаўскі, Нараўлянскі, Чувускі, Лагойскі, раёны за весь час не далі ні аднае зводкі ў Наркамснаб аб выкананьні пляну кантрактацыі, а гэга сьведчыць аб тым, што яны і не пачыналі праводзіць кантрактацыю.

А вось другая група раёнаў з ганебнымі паказчыкамі выкананьня.

Па збожжавых культурах плян кантрактацыі выканан: Жыткавіцкім раёнам на 0,6 проц., Церахаўскім—0,3 проц., Капаткевіцкім—0,2 проц., Сьмілавіцкім—2,5 проц., Дубровенскім—0,4 проц., Сураскім—0,6 проц., Халопеніцкім—0,8 проц

Па тэхнічных культурах (ільнаводныя раёны): Багушэўскі—3,1, проц. Вульскі—14 проц., Крупскі—16 проц. Ветрынскі—16,5 проц.

Асаблівы „рэкорд" паставіў Касьцюковіцкі раён, які, замест 9900 га па пляну, закантрактаваў збожжавых культур 4 га і тэхнічных 0,3 проц., Краснапольскі раён, замест 3471 га тэхкультур па пляну, закантрактаваў 1 га.

Мы заносім Краснапольскі, Касьцюковіцкі, Жыткавіцкі, Церахаўскі, Багушэўскі і Капаткевіцкі раёны і сэкратароў РК ЛКСМБ гэтых раёнаў на чорную дошку за зрыў пляну, бязьдзейнасьць і безадказнасьць у правядзеньні гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі

Мы патрабуем ад сэкратароў РК КСМ тав. Капрыянава (Краснаполье), Шэнкмана (Капаткевічы), Дворнікава (Церахаўскі раён), Ржэвуцкага (Багушэўскі), Шылера (Жыткавіцкі), і бюро Касьцюковіцкага РК даць на старонках газэты „Чырвоная Зьмена" адказ: чаму такі ганебна нізкі процант выкананьня пляну, якія захады ўжываліся, каб забясьпечыць 100 проц. кантрактацыю яравога пасеву?

ОРГАНІЗАВАНЫ КОЛГАС ІМЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ"

ГОМЕЛЬ, 6. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).—У Даўгалесе (Гомельскі раён) сіламі комсамольскай ячэйкі організаваны колгас імя „Чырвонай Зьмены" з дваццаці гаспадарак.

Гэтымі днямі ў Даўгалес выяжджае спэцыялізаваная брыгада сумесна з прадстаўніком Гаркому комсамолу для практычнай дапамогі новаорганізаванаму колгасу.

Цішка Верны.

Аддаліся ўладзе самацёку

БАРЫСАЎ.—Нягледзячы на шматлікія сыгналы друку аб ганебных тэмпах у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, раённыя організацыі Барысаўскага раёну ня ўжылі захадаў, каб узьняць тэмпы падрыхтоўкі.

На 20 сакавіка пляны веснавой сяўбы даведзены да колгасаў на 68 проц. у Кішла-Слабодзкім, Халхавіцкім і Перасацкім сельсаветах пляны не даведзены да двара.

Мінэральнае ўгнаеньне трымаецца на складах. З 151 тоны колгасам выдана толькі 35 тон, альбо 23,9 проц. На складах Райколгассаюзу ляжыць 166 плугоў, 48 радковых барон, 71 радковая сеялка і інш. сельска-гаспадарчыя машыны.

Загатоўка насеньня зрываецца. Плян загатоўкі вікі выканан на 1,1 проц., лубіну—на 0,14 проц., сэрадэлі—9,3 проц., кармовай морквы і гуркоў ні адзін процант.

Праца па кантрактацыі ў раёне не разгорнута. На 15—III незакантрактавана ніводнага га яравога пасеву. Пляны кантрактацыі ў большасьці сельсаветаў не даведзены да колгасаў і вёсак. Кугель

У аднаасобнікаў не закантрактавана ніводнага га

СЛУЦАК. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Кантрактацыя яравых, якая павінна была закончыцца к 1 красавіка, фактычна зрываецца, што прымушае біць трывогу.

Аднаасобны сэктар не закантрактаваў ні аднаго гектара тэхнічных культур, Таксама па колгасным сэктары кантрактацыя тэхнічных культур аформлена на 32 проц. махоркі—56 проц.

Раённая організацыя комсамолу не надала гэтаму належнай палітычнай важнасьці і ня ўключылася па-ударнаму ў правядзеньне гэтай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Трэба ўдарыць па опортуністычнай бязьдзейнасьці раённых організацый і зараз-жа па-ўдарнаму ўзяцца за выкананьне пляна ў кантрактацыі.

Прыбытак

Ня выконвае рашэньняў 6 зьезду саветаў

Абязьлічка не ліквідавана, праца не пераведзена на зьдзельшчыну

Прытарфяны саўгас імя Лекерта (Менск) яшчэ не пачаў падрыхтоўкі да веснавай сяўбы. Кіраўніцтва саўгасу гэтым не займаецца. Сельска-гаспадарчы інвэнтар і транспорт не рамантуецца. Праца ў саўгасе арганізавана няправільна, ня выканан прамфінплян па закладцы парнікоў.

Згодна пляну, раньніх парніковых рам трэба закласьці 900, сярэдніх 800 і позьніх 400. На першае красавіка павінны быць гатовы 1600 рам, а закладзена толькі 1048. Заданьне выканана толькі на 50 проц.

Гэты прарыў атрымаўся з прычыны нерацыянальнага скарыстоўваньня рабсілы. Да гэтага часу саўгас ня мае асобных брыгад на асобных галінах гаспадаркі. Надыходзіць сяўба. Адміністрацыя і рабочкамітэт не клапоцяцца аб тым, каб размеркаваць рабочых па брыгадах і ўвязаць зьдзельшчыну.

Яшчэ не прапрацавана пастанова зьезду саветаў аб саўгасным будаўніцтве, не ліквідавана абязьлічка як у адносінах трактароў, так і іншых сельска-гаспадарчых машын.

Трэба зараз-жа перабудаваць работу саўгасу так, каб выканаць пастановы 6-га зьезду, запяша правільнай арганізацыяй працы, зьдзельшчынай і ліквідацыяй абязьлічкі. Прыняць усе захады для выкананьня прамфінпляну і насычанага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

Пост „Чырвонай Зьмены"—Вока.

ЮНКОРЫ ПІШУЦЬ

Па Дукорскім сельсавеце (Сьмілавічы) плян кантрактацыі яравых даведзены да вёсак і колгасаў.

Заданьне па кантрактацыі малака выканана на 70 проц.

Рэдзька В.

Комсамольцы ячэйкі „Новы Шлях" (Сьмілавічы) ня правялі ні аднаго сходу для растлумачэньня адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі. Ячэйка не дапамагае с/с наладзіць гэту работу.

Л. Дзяргач

Бобраўскі мессавет (Крупскі раён) не праводзіць кантрактацыі яравых. вина масавай работы па колгасах і вёсках.

Ш. Х. С.

НАРАЎЛЯНСКІ РАЙКАМОЛ АДКАЗВАЕ

НАРАЎЛЯНЫ, 9. (Па тэлеграфу). З мэтай зьняць з чорнай дошкі ваш раён і Райком і ліквідаваць прарывы ў ільназагатоўках, увесь склад Райкому і раённы актыў мабілізаваны і накіраваны ў сельсаветы.

Дадзены канкрэтныя опэрацыйныя заданьні комсамольскім ячэйкам.

Па загатоўкам лёну праведзена нарада сэкратароў ячэек.

Прымаюцца рашучыя захады ліквідаваць прарывы і выканаць плян ільназагатовак.

Райкамол.

КСУ—у баку ад другой бальшавіцкай

Слуцак.

Камітэты сялянскай узаемадапамогі ў большасьці сельсаветаў раёну бязьдзейнічаюць. Ніякай работы па спагнаньню разданай насенссуды, складаньню насенных фондаў для бедняты, рамонту інвэнтара і ачысткі насеньня не праводзіцца. Асаблівую бязьдзейнасьць праяўляюць Урэцкі, Лучнікоўскі, Івана-агародніцкі і Кастрычнікоўскі сельКСУ.

РайКСУ належыць разам з сельскімі камітэтамі загатовіць 97 тон яравога насеньня бедняты, а загатоўлена толькі 64 тоны. Па лініі КСУ трэба ачысьціць 403 тоны насеньня, а ачышчана толькі 50 тон або 14 проц. пляна. Сабраць попелу трэба было 180 тон, заданьне выкана толькі на 4 проц.

Неабходна ўцягнуць сельКСУ у падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Ян Прыбытак

Пляны кантрактацыі не даведзены да колгасаў і вёсак

УЗДА.—Адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі ў большасьці комсамольскіх ячэек раёну не прапрацавана. Комсамольская ячэйка Прыбыўскага сельсавету зусім бязьдзейнічае. Па вёсках гэтага сельсавету не праведзена сходаў з сялянствам і моладзьдзю, не растлумачана ім гаспадарча-палітычнае значэньне кантрактацыі.

К-ец

Разьбіць кулацкі сабатаж,

узяць бальшавіцкія тэмпы ў ільназагатоўках і кантрактацыі

Па раду раёнаў БССР ільназагатоўкі за апошнія дзьве дэкады замёрлі. Крывая загатовак ня ўзьнімаецца. Кулакі ня выканалі і нават зьменшаных цьвёрдых заданьняў, не выяўляюцца новыя кулацка-заможныя гаспадаркі.

Кантрактацыя новых пасеваў лёну ідзе нездавальняюча.

Як паказваюць лічбы выкананьня пляну, кантрактацыя аддана пад уладу самацёку.

Дамо слова лічбам.

Петрыкаўскі раён

Плян ільназагатовак на 15-III выканан на 30,1 проц., на 1-IV крывая загатовак узьнялася толькі да 30,4 проц., а на 5-IV застыгла на мёртвым пункце. Плян загатовак пянькі на 5-IV даў толькі 9 проц. Знайшлі ў раёне кулакоў 4,9 проц. і абклалі іх на 3.8 проц. Спагналі з кулакоў ільна-валакна толькі 43,5 проц., а ільнанасеньня 47,3 проц.

Плян кантрактацыі лёну на 5-IV выканан усяго на 23 проц.

Азарыцкі раён

На 20-III плян загатовак ільнавалакна быў выканан на 19 проц., на 1-IV крывая загатовак узьнялася толькі на 0,4 проц., а на 5-IV ня зрушылася з мёртвага пункту—19,4 проц. Пянькі загатоўлена толькі 3 проц. пляну, закантрактавана лёну на будучы год 14 проц. пляну. Азарыцкі раён у ільназагатоўках ганебна цягнецца ў хвасьце.

Крычаўскі раён

Плян ільназагатовак на 20-III выканан на 22,6 проц., на 1-IV—23,7 проц., на 5-IV—23,8 проц. Рост тэмпаў загатовак зусім ганебны.

Выявілі кулакоў 3,2 проц., абклалі іх заданьнем у 27,2 проц. да раённага пляну, спагналі-ж цьвёрдага заданьня толькі—27 проц.

Плян кантрактацыі на раёне выканан на 26 проц.

Любаньскі раён

На 10-III г. г. плян ільназагатовак выканан на 31,2 проц., на 1-IV—крывая ільназагатовак пала ўніз да 24,4 проц., а 5-IV затрымалася на 24,7 проц. Плян пянькі на 5-IV выканан толькі на 1 проц.

Спагнана з кулакоў цьвёрдага заданьня ільнавалакна 19,2 проц., кулакоў выяўлена 4,4 проц., абкладзена на 5,8 проц. Кантрактацыя лёну на будучы год праведзена на 30 проц.

Пухавіцкі раён

На 1-IV плян ільназагатовак выканан на 34,2 проц., а на 5-IV—на 34,2 проц. Плян пянькі выканан на 1 проц.

Выяўлена кулакоў усяго толькі 1-1 проц. якія абкладзены на 3.2 проц. Спагнана цьвёрдага заданьня—нічога.

Плян кантрактацыі лёну на будучы год выканан на 25 проц.

Чэрвеньскі раён

Плян ільназагатовак на 20-III—выканан на 19 проц. На 1-IV крывая выкананьня ўзьнялася да 19,7 проц. і на 5-IV да 20,5 проц.

Выяўлена кулакоў 3,7 проц., абкладзена—,8 проц. Спагналі 42 проц.

Плян кантрактацыі даў 26 проц., пянькі 4,7 проц.

Паданыя лічбы аб стане загатовак і нарастаньні іх тэмпаў сьведчаць аб тым, што кіраўніцтва раённых організацый безадказна адносіцца да выкананьня пляна ў ільназагатовак, не націскае на кулака, і зусім дрэнна праводзіць кантрактацыю пасеваў лёну на будучы год.

Мы пытаем сэкратара Крычаўскага РК ЛКСМБ—тав. За эмбу, Петрыкаўскага—Фарапонава, Любаньскага—Макарэвіча, Азарыцкага—Баранкіна, Пухавіцкага—Канаша, Чэрвеньскага—Сакалоўскага: чаму крывая загатовак лёну застыгла на мёртвым пункце, чаму не спагнана з кулакоў цьвёрдае заданьне, чаму яны ня прыцягнуты да адказнасьці за сабатаж, чаму зрываецца кантрактацыя тэхнічных культур на будучы год? Тэрмінова патрабуем даслаць адказ у рэдакцыю.

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радах соцыялістычнага будаўніцтва



На працягу двухдэкадніка штурму прарываў на заводзе „ДА“ (Менск) організаваны тры вытворчыя комуны і дзьве ўдарныя брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі зборачнага цэху.

Лепшай ударнай брыгадай кіруе малады комсамолец—тав. Палесоўскі. Гэта брыгада выканала прамфінплян за март месяц на 110 проц. За апошнія дні наглядаецца значнае перавыкананьне пляну. Брыгада карыстаецца вялікім аўторытэтам

На здымку—ударная комсамольская брыгада. Зьлева направа: т. т. Маршак, Лапідус, Палесоўскі (брыгадзір) Кугель, Самковіч і Розэмблюм.

Перамога рэволюцыйнай профопозыцыі

БЭРЛІН, 10.—На выбарах ў заводзкі камітэт прадпрыемства „Аэг“ (электрычны концэрн) у Генінгсдорфе (каля Бэрліна) рэволюцыйная профопозыцыя, ня гледзячы на масавыя звальненьні рэволюцыйных рабочых на гэтым прадпрыемстве, атрымала перамогу. За чырвоны сьпіс была падана 1.009 галасоў (у мінулым годзе—1371) за сьпіс рэформістых 684 (летась—997) за сьпіс нацыянал-соцыялістых (фашыстых)—53 галасы (сьпіс выстаўлен упяршыню). Колькасьць галасоў, паданых за кандыдатаў рэволюцыйнай профопозыцыі, у адносінах да агульнай колькасьці рабочых, павялічылася з 58 да 60 проц. Рэволюцыйная профопозыцыя атрымала ў рабочым савеце 8 мандатаў.

БЭРЛІН. 9.—На адбыўшымся ў Бэрліне, ня гледзячы на забарону Гржэзінскага, агульнанямецкім зьездзе рэволюцыйнага адзінства моладзі прысутнічала ўвогуле (разам з гасьцямі) звыш 2 тысяч чалавек, у тым ліку 15 прадстаўнікоў рабочае моладзі Ангельшчыны, Францыі, Аўстрыі, Швэцыі, Даніі і Чэха-Славакіі. На паседжаньнях зьезду ўдзельнічала 300 дэлегатаў з усіх частак Нямеччыны, у тым ліку ад важнейшых буйных прадпрыемстваў, у прыватнасьці ад прадпрыемства ваеннай прамысловасьці. Сярод дэлегатаў былі таксама маладыя рабочыя, якія да гэтай пары былі ў каталіцкіх соцыял-дэмократычных організацыях і ў рэйхсбанэры.

Зьезд быў прыгожай дэмонстрацыяй баявога настрою. Аднагалосна была прынята адозва да ўсёй працоўнай моладзі Нямеччыны. Таксама аднагалосна прынята рашэньне аб скліканьні бліжэйшага агульнанямецкага зьезду працоўнай моладзі.

Комсамольскія сьцягі над Нямеччынай

БЭРЛІН, 9.—Амаль што ва ўсіх буйных гарадох Нямеччыны 5 і 6 красавіка адбыліся дэмонстрацыі протэсту супроць забароны агульнанямецкага зьлёту моладзі. У Гамбургу адбылася дэмонстрацыя, ў якой прымалі ўдзел звыш 2 тысяч маладых рабочых. У Браўншвэйгу, дзе быў забаронены зьлёт моладзі, адбыліся рэволюцыйныя выступленьні ва ўсіх частках гораду.

У ноч на 5 красавіка ў шмат якіх частках гораду былі расклееныя рэволюцыйныя плякаты. У прыгарадах Браўншвэйгу былі праведзены комуністычныя сходы, удзельнікі якіх організавалі стыхійныя дэмонстрацыі. Арыштавана 120 чалавек. Увечары на адной з плошчаў Браўншвэйгу зноў стварылася дэмонстрацыя, у якой удзельнічала звыш тысячы чалавек. Паліцыя жорстка біла дэмонстрантаў гумовымі дубцамі і тут-жа арыштавала яшчэ 219 чалавек.

Ва Ўсходняй Прусіі адбыліся шматлікія дэмонстрацыі протэсту супроць паліцэйскай забароны. Масавыя мітынгі і дэмонстрацыі былі праведзены ў Інстэрбургу, Кенігсбэргу і ў шмат іншых гарадох Усходняй Прусіі. Пераехаўшыя праз нямецкую граніцу з Данцыга два грузавікі з маладымі рабочымі былі затрыманы паліцыяй і перакінуты назад праз граніцу.

Маладыя фашысты дзейнічаюць

Напад паліцыі на рэволюцыйную дэмонстрацыю піонэраў

НЬЮ-ЁРК, 9.- У Лёс-Анжэлёсе (Каліфорнія) піонэры наладзілі дэмонстрацыю протэсту супроць звальненьня 12 рэволюцыйных вучняў мясцовай гімназіі. На дэмонстрацыю напалі вучні—члены шовіністычнай організацыі „корпусу афіцэраў запасу“.

Паліцыя выступіла на баку фашысцкіх малайцоў, і двух піонэраў арыштавала. Пасьля разгону дэмонстрацыі маладыя фашысты адправіліся ў рабочы цэнтр і пачалі граміць рабочы коопэратыў. Служачыя коопэратыву былі моцна зьбіты. Комсамолку Клей, якая ішла на мітынг, скліканы комсамолам, фашысты зацягнулі ў аўтомобіль і парэзалі ёй брытвай рукі і ногі.

ПА-БАЯВОМУ УКЛЮЧЫЦЦА У МАСАВЫ АГЛЯД-САМАПРАВЕРК[У]

ПАСТАНОВА СЭКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б АБ СЕЛЬСКІМ, РАЁННЫМ І НІЗАВЫМ ДРУКУ

1. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб сельскім, раённым і нізавым друку ставіць перад усёй КП(б)Б адказьнейшыя задачы ў галіне далейшага пашырэньня сельскага, раённага і нізавога друку, значнага павышэньня яго якасных паказчыкаў і самага шырокага разгортваньня рабселькораўскага руху, а таксама стварэньня ў кожным раёне раённай газэты і ў кожным саўгасе, колгасе, МТС, населеным пункце насьценнай газэты, пры абавязковай ўмове забясьпечаньня сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва імі ў адпаведнасьці з задачамі разгорнутага па ўсім фронце соцыялістычнага наступленьня.

Сэкратарыят ЦК КП(б)Б адзначае поўнае выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб давядзеньні колькасьці існуючых раённых і гарадзкіх газэт да 33, а таксама ўкомплектаваньне кіруючага складу ў іх новастораных газэт, забясьпечаньне опэрацыйнага кіраўніцтва імі, стварэньне раду курсаў для работнікаў раённых газэт і г. д.

2. Для выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб сельскім, раённым і нізавым друку, лічыць неабходным:

а) пры сэктары друку Культпропу ЦК стварыць групу па-заштатных інструктароў, для якіх гэтыя абавязкі лічыць асноўнай партыйнай нагрузкай, зацьвердзіць дадзены пры гэтым пэрсональны сьпіс інструктароў. Усклаесьці на па-заштатных інструктароў пэрсональную адказнасьць перад ЦК КП(б)Б за сыстэматычныя (тэматычныя) агляды раённых газэт і за сваячасовую сыгналізацыю Культпропу ЦК аб наяўнасьці памылак і недахопаў у гэтых газэтах. Культпропу ЦК організаваць выезд брыгад для абсьледваньня і дапамогі сельскім, раённым і нізавым газэтам;

б) абавязаць усе цэнтральныя газэты БССР рэгулярна зьмяшчаць агляды раённага і нізавога друку, прыраўнаўшы па свайму значэньню агляды друку да перадавых артыкулаў.

Зацьвердзіць данную пры гэтым прапанову Культпропу ЦК аб прымацаваньні фабрычна-заводзкіх і вясковых шматтыражак да пэўных цэнтральных газэт;

в) безадкладна стварыць у кожнай з цэнтральных гарадзкіх і раённых газэт аддзел рабселькораў і ўдарных брыгад, у складзе якога мець асобага інструктара па рабоце сярод прымацаваных шматтыражак;

г) абавязаць ўсе РК КП(б)Б забясьпечыць сыстэматычнае кіраўніцтва раённым і нізавым друкам, выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) аб тым, што „нізавым друкам раёну і работаю сярод рабселькораў павінны кіраваць райпарткомы, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу партыйныя ячэйкі і рэдакцыі раённых газэт“, даклады рэдакцыі на бюро і плепумах РК, узмацненьне складу рэдакцыі партыйна-вытрыманымі і падрыхтаванымі работнікамі і г. д,—рэдактары раённых газэт абавязкова павінны вылучацца са складу членаў бюро РК КП(б)Б;

д) да канца 1931 году ва ўсіх раёнах стварыць раённыя газэты і шматтыражкі ў найбольш буйных саўгасах колгасах, па ўсіх МТС. Орыентовачна зацьвердзіць прапанову Культпрому ЦК аб організацыі ў БССР да лістапада 1931 г. дадатковых 107 шматтыражных і шклографічных (газэт на шклографе), з іх 10 ў саўгасах, 18 у калгасах, 12 у МТС, 11 буйных чыгуначных і водных, транспортных вузлох і на прадпрыемствах, і 56 ў якасьці раённых шклографічных газэт, а таксама на працягу 4-х месяцаў організаваць 14 новых раённых друкаваных газэт на базе ўжо існуючых друкарань.

У сувязі са значным павялічэньнем колькасьці газэт і неабходнасьцю забясьпечыць кіраўніцтва імі з боку ЦК вылучыць дадаткова для сэктару друку Культпрому ЦК КП(б)Б двух штатных інструктароў (праводзячы аплату па бюджэце друку).

е) абавязаць Поліграфаб'яднаньне ВСНГБ, пад пэрсанальную адназнасьць тав. Сянчука, даць паказаньне ўсім існуючым друкарням, што бесьперабойны выхад раённых газэт зьяўляецца асноўнаю работаю друкарань. Зацьвердзіць прапанову брыгады Культпропу ЦК аб адабраньні 17 друкарскіх машын і перакінуць іх у раёны Абавязаць менскую і гомельскую друкарні вызначыць абсталяваньне для двух раённых друкарань.

Абавязаць Поліграфаб'яднаньне ВСНГБ пераразьмеркаваць наяўнае старое абсталяваньне і адрамантаваць паламаныя друкарскія машыны з мэтаю забясьпечаньня імі раённых друкарань.

Зьвярнуцца ў ЦК УсеКП(б) аб неабходнасьці пазачаргового водпуску шрыфтоў для раённых друкарань БССР. У існуючых друкарнях, там, дзе гэта неабходна, організаваць трохзьменную работу і поўнасьцю загрузіць наяўнае поліграфабсталяваньне, правёўшы адпаведныя рацыяналізатарскія мерапрыемствы і яшчэ больш разгарнуўшы ў друкарнях соцспаборніцтва і ўдарніцтва;

ж) 50 проц. агульнай колькасьці надыходзячага выпуску студэнтаў Комвузу імя Леніна, накіраваць на адказную газэтную работу. Да 10 красавіка вызначыць пэрсональны сьпіс гэтых студэнтаў і організаваць для іх пры Комвузе двухмесячныя курсы. Абавязаць ЦК ЛКСМБ правесьці на працягу красавіка мобілізацыю 50 палітычна падрыхтаваных комсамольцаў-актывістых для вылучэньня адказнымі сэкратарамі раённых і шматтыражных газэт.

Вылучыць з апошняга курсу наргасу і саўбуду па 5 чалавек: з літаратурнага аддзяленьня БДУ—15 чал. і з беларускага, польскага і яўрэйскага пэдагогічных менскіх тэхнікумаў па 5 чалавек, з віцебскага, гомельскага і магілеўскага белпэдтэхнікумаў па тры чалавекі—для накіраваньня на газэтную работу. Мобілізаваць з апошняга курсу магілеўскага ўсебеларускага політасьвет-тэхнікуму 20 чал. і накіраваць пасьля праходжаньня месячных курсаў на работу ў газэты прымежных раёнаў;

з) праз 2 дэкады заслухаць на сэкратарыяце ЦК даклад упаўнаважанага Наркампаштэлю аб мерапрыемствах па палепшаньні распаўсюджваньні і дастаўкі раённых газэт;

і) Белкоопсаюзу і ўпаўнаважанаму Наркампаштэлю забясьпечыць радыёапаратурай у першую чаргу раённыя газэты, а потым і саўгасныя і колгасныя шматтыражкі і насьценныя газэты;

к) для падрыхтоўкі кадраў для раённых газэт паскорыць адкрыцьцё газэтных аддзяленьняў пры Гомельскай саўпартшколе і ўсебеларускім палітасьвет-тэхнікуме. Пашырыць контынгент студэнтаў газэтнага аддзяленьня пры КУБ'е да 75 чал., перакінуўшы туды частку студэнтаў з іншых аддзяленьняў Комвузу. Контынгент газэтнага аддзяленьня на 1932 г. устанавіць у 100 чал. Тэрмін навучаньня на газэтным аддзяленьні Комвузу уста[на]віць у тры гады.

У лік накіраваных на курсы па[ртыйнага] актыву ўключаць работнікаў раённ[ых] газэт. Прасіць культпроп ЦК КП(б) прысылцы кіраўніка для асьпіранцкі групы БАН—газэтных работнікаў;

л) абавязаць ТАСБЕЛ раз у дэка[ду] выпускаць бюлетэнь у дапамогу ра[ён]ным газэтам. Адказным рэдактарам б[ю]летэня зацьвердзіць тав. Паўлоўска[га];

м) організаваць двухдэкадныя кур[сы] для рэдактароў у новаорганізуем[ых] саўгасах і колгасах шматтыражак (… 100 чалавек) НКЗ і Колгасцэнтру за[]бясьпечыць курсы сродкамі;

н) даручыць СНК прагледзіць … бюджэту сродкі для ствараемых, зго[дна] па пастановы ЦК УсеКП(б), нов[ых] 33 раённых газэт, часткова пакрыўш[ы] выдаткі за кошт агульных асыг[на]ваньняў на друк. Выдаткі па шма[т]тыражках аднесьці за кошт адпаве[д]ных грамадзкіх і гаспадарчых арга[ні]зацый;

о) рэдактары шматтыражак зацьвя[р]джаюцца адпаведнымі РК КП(б)Б;

п) абавязаць аддзел кадраў ВСНГ[Б] тэрміновым парадку забясьпечыць м[е]рапрыемствы па організацыі карот[ка]тэрміновых курсаў для падрыхтоў[кі] наборшчыкаў у Менску, Віцебск[у,] Гомелі, Магілеве, Бабруйску і Пола[ц]ку.

3. Сэкратарыят ЦК КП(б)Б па[д]крэсьлівае, што поўнае і хутчэйша[е] выкананьне ўсімі організацыямі КП(б)[Б] пастановы ЦК УсеКП(б) аб сельскі[м,] раённым і нізавым друку, павінна б[у]дзе забясьпечыць далейшы магутн[ы] ўздым рабсельскораўскага ўдарніцка[га] руху, яшчэ больш шырокае разгорт[ва]ваньне пролетарскай самакрытыкі, яшчэ большае павышэньне месца пр[о]летарскага друку ў барацьбе за абу[]дову фундаманту соцыялістычнай эко[]номікі СССР.

4. Культпропу ЦК праверыць пра[]вядзеньне ў жыцьцё гэтае паст[ано]в[ы] і праз тры месяцы далажыць ЦК.

ПАСТАНОВА

бюро ЦК ЛКСМБ аб уключэньні комсамольскай організацы[і] ў масавы агляд-самаправерку працы нізавога друку

За апошнія гады, у цеснай сувязі з буйнымі тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва, праходзіў буйны як палітычны, так і організацыйны рост рабселькораўскага руху. Армія рабселькораў за першыя гады 5-ці годкі паказала сябе як агітатар і організатар працоўных мас у барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе за выкананьне 5-ці годкі.

Надаючы вялікае палітычнае значэньне далейшаму ўзмацненьню рабселькораўскага руху, ЦК КП(б)Б абвясьціла масавы агляд—самаправерку працы нізавога друку.

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК ЛКСМБ, па пытаньню ўдзелу комсамолу ў масавым аглядзе-самаправерцы нізавога друку і ў падрыхтоўцы да ўсебеларускага зьезду рабселькораў, абавязвае ўсе ГК і РК ЛКСМБ:

1) Тэрмінова ўключыцца ў правядзеньне агляду-самаправеркі нізавога друку, які павінен прайсьці пад лёзунгам яшчэ большага ўзмацненьня ролі нізавога друку ў організацыі рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад савецкай краінай.

2) Зараз-жа на ўсіх прадпрыемствах, у саўгасах, колгасах, МТС і паасобных брыгадах організаваць брыгады па агляду працы насьценгазэт і шматтыражак і кіраўніцтва нізавым рабселькораўскім актывам, прыцягнуўшы да гэтае справы ўсіх юнкораў, сьценкораў, комсамольцаў і беспартыйную моладзь.

Адначасова праверыць, які ўдзел прымае комсамольская організацыя ва ўзмацненьні ролі нізавога друку і кіраўніцтве юнкор. рухам.

3) Дабіцца, каб лёзунг: „Кожны юнкор—ударнік, кожны ўдарнік—юнкор“ быў поўнасьцю ажыцьцёўлены, організуючы ўдарныя юнкораўскія брыгады для ўзмацненьня працы насьценгазэт.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

14-га красавіка 1931 г., а 7-й гадз. увеч., у памяшканьні клюбу харчавікоў

— АДБУДЗЕЦЦА —

УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ

ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЛКСМБ

СУПОЛЬНА З АКТЫВАМ

═ прысьвечанае ═

Х-ці гадоваму юбілею газэты „Чырвонай Зьмены“ і вынікам усесаюзнай рабселькораўскай нарады

Пасьля ўрачыстай часткі—пастаноўка Беларускага ТРАМ'у „ПЛАВЯЦЦА ДНІ“

Білеты ў Гаркоме ЛКСМБ з 9-й гадз. раніцы да 4-й дня.

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599